# Раскрыць ДНК здрады...

## *Прэзентацыя кнігі Ігара Марзалюка «Кроў на белым тле» адбылася ў галоўнай бібліятэцы краіны*

**Здаецца, столькі ўсяго напісана пра Вялікую Айчынную вайну, але тэма невычэрпная... Унікальнае выданне «Кроў на белым тле...» прадставілі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Не хочацца называць яго чарговым, бо, па сутнасці, яно першае, дзе сістэмна і грунтоўна паказана гісторыя дзейнасці беларускіх калабарацыяністаў у часы акупацыі БССР. Гэта насамрэч тытанічная праца!**

Аўтар кнігі (яна выйшла ў выдавецтве «Беларусь» накладам 2500 асобнікаў) – Ігар Марзалюк, беларускі гісторык, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь – на падставе навуковых архіўных крыніц аналізуе дзейнасць тых (не хочацца нават называць іх людзьмі), хто быў на баку фашыстаў і падзяляў нацысцкую ідэалогію, рэалізоўваў палітыку генацыду, скіраваную супраць беларускага народа. Гэта той самы выпадак, калі гісторыя ажывае праз дакументы і сведчанні на старонках кнігі. З унікальным матэрыялам Ігар Марзалюк працаваў на працягу пяці гадоў, шукаючы звесткі ў Нацыянальным архіве і ва Упраўленні КДБ па Магілёўскай вобласці.



На прэзентацыі выдання прысутнічала вялікая колькасць людзей, а значыць гэтая тэма сапраўды важная для нашага грамадства. Прыйшлі не толькі калегі па дэпутацкім корпусе і гісторыкі, але і моладзь, што сведчыць: тым, ад каго залежыць будучыня Беларусі, яна небыякавая.

Генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Вадзім Гігін выказаў упэўненасць, што даследаванне не толькі зойме пачэснае месца на кніжных паліцах, але і будзе весці за сабой. Ён назваў гэтую кнігу і навуковай, і грамадскай з'явай. Вадзім Гігін перакананы: нарэшце ў нас з'явілася аператыўная гістарычная публіцыстыка, якая адгукаецца на тыя запатрабаванні, што сёння існуюць у беларускім грамадстве.

– Менавіта цяпер важна звярнуцца да той тэмы, якая ўсім баліць, вакол якой заўсёды шмат домыслаў, міфаў, створаных рознымі бакамі. І тут важна разабрацца, што адрознівае стыль Ігара Аляксандравіча ў гэтым «акіяне», бо ён, як сапраўдны штурман, пракладвае шлях, на які і трэба арыентавацца, – адзначыў Вадзім Гігін. – Гістарычная проза прафесара Ігара Марзалюка, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук адрозніваецца тым, што абапіраецца на грунтоўную дакументальную аснову. Ён паказвае такую з'яву, як дзейнасць беларускіх калабарацыяністаў у гістарычным развіцці, прычым пачынае з тых тэарэтыкаў, якія калісьці складалі фундамент гітлераўскай ідэалогіі. У Ігара Аляксандравіча ўсё не толькі вельмі грунтоўна, але і эмацыянальна.



Як адзначыў падчас прэзентацыі сам аўтар, ён з'яўляецца не прапагандыстам, а прафесійным гісторыкам, які ў сваёй кнізе паказвае тыя злачынствы, пра якія важна памятаць сёння.

– Гэтае выданне пра тое, што робіць чалавека чалавекам і што яго расчалавечвае. Ёсць гісторыкі, якія пішуць з пазіцыі апраўдання, я лічу гэта няправільным, – тлумачыць Ігар Марзалюк. – Гісторыя – навука маральная. Забойства жанчын, дзяцей, наогул мірных людзей нельга апраўдаць ніякай ідэалогіяй. Калі працаваў з рассакрэчанымі архіўнымі дакументамі, мяне асабліва ўразіла тое, як звычайны лагойскі хлопчык расстрэльваў людзей і спальваў хаты ў той вёсцы, куды ён хадзіў калісьці на танцы. І такі факт, на жаль, не адзіны... І ўсё ж Беларусь – самая антынацысцкая дзяржава, дзе было самае моцнае супраціўленне.

Ігар Марзалюк бачыць трагедыю нашай краіны ў тым, што немцы выклікалі этнічныя канфлікты для рэалізацыі сваіх планаў падчас Вялікай Айчыннай вайны. Гаворка пра знакаміты план «Ост». Аўтар акцэнтаваў асаблівую ўвагу на главе «Забіваючы словам», дзе распавядаецца пра стварэнне вобраза ворага.

Дырэктар выдавецтва «Беларусь» Алесь Карлюкевіч нагадаў і пра іншыя кнігі, прысвечаныя тэме генацыду беларускага народа. Выступоўца назваў трагічную біяграфію нашага народа падчас Вялікай Айчыннай вайны глыбокім калодзежам, у якім яшчэ шукаць і шукаць тыя крыніцы, якія мы павінны данесці наступным пакаленням.

**Ірына ПРЫМАК**

**Фота дасланы Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі**